# АДНА З ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

**Аб гэтым заявіў учора міністр культуры Павел Латушка на адкрыцці міжнароднага кангрэса «Нацыянальная бібліятэка як феномен культуры», прысвечанага 90-годдзю НББ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

НББ цесна звязана з гісторыяй краіны. «Шлях, які прайшла бібліятэка, — гэта прыклад самаадданага служэння беларускаму народу, ідэалам дабра і гуманізму. Роля бібліятэкі ў захаванні і развіцці ўнікальнага інфармацыйнага рэсурсу краіны надзвычай важная», — лічыць міністр культуры.

На яго думку, НББ уяўляе сабой новы тып сучаснай бібліятэкі, знаходзіцца ў шэрагу лепшых бібліятэк свету, з'яўляецца адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці і візітнай карткай Мінска.

СТАР. 2

# АДНА З ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Павел Латушка нагадаў, што бібліятэка асвоіла прагрэсіўны метад работы з электроннымі носьбітамі інфармацыі, паспяхова выкарыстоўвае інавацыйныя формы бібліятэчнага абслугоўвання, аператыўна і якасна задавольвае ўніверсальныя інфармацыйныя патрабаванні карыстальнікаў у інтарэсах айчыннай навукі, эканомікі, вытворчасці, культурнай і духоўнай сфер. Імкнучыся адпавядаць патрабаванням сучаснага інфармацыйнага грамадства, НББ стала адным з ініцыятараў буйнамаштабнага праекта па стварэнні Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, рэалізацыя якога актыўна пачынаецца з гэтага года.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле слоў Паўла Латушкі, сімвалічна, што юбілей галоўнай бібліятэкі краіны адзначаецца ў 2012 годзе, які на рэспубліканскім узроўні аб'яўлены Годам кнігі. Менавіта кніга і асветніцтва калісьці сталі асновай развіцця бібліятэк, якія на працягу стагоддзяў з'яўляюцца важнейшым складальнікам нацыянальнай культуры, адным з галоўных прыярытэтаў сацыяльнага развіцця краіны. Стагоддзямі бібліятэкі на беларускай зямлі служаць справе асветніцтва, развіццю роднай мовы, умацаванню нацыянальнай культуры, павышэнню культурнага і навуковага патэнцыялу нацыі, атрыманню ведаў аб развіцці свету. Бібліятэкі ажыццяўляюць інфармацыйнае забеспячэнне сучаснага грамадства, ураўноўваюць магчымасці ўсіх жыхароў рэспублікі на доступ да інфармацыі і ведаў, ствараюць адзіную інфармацыйна-культурную прастору. Прызнаючы вялікую ступень уплыву бібліятэк на развіццё ўсіх сфер жыцця грамадства і адчуваючы сацыяльна-эканамічны эфект ад іх дзейнасці, беларуская дзяржава ажыццяўляе і будзе ажыццяўляць паслядоўную і мэтанакіраваную палітыку па развіцці бібліятэчнай справы, падкрэсліў міністр культуры.



Ён таксама дадаў, што нацыянальныя бібліятэкі ва ўсім свеце выконваюць асаблівую функцыю, таму іх падтрымцы ўдзяляецца асаблівая ўвага з боку дзяржавы. Кангрэс, які праходзіць у Мінску, яшчэ раз звяртае ўвагу на значнасць нацыянальнай бібліятэкі, яе выключную ролю ў захаванні і развіцці культуры.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў форуму звярнуўся намеснік генеральнага дырэктара ЮНЕСКА па пытаннях камунікацыі і інфармацыі Яніс Каркліньш.

Кангрэс, які прадоўжыцца да 7 верасня, сабраў больш за 400 удзельнікаў з 30 краін. Сярод запрошаных — спецыялісты з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Малдовы, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана, Грузіі, Балгарыі, Венгрыі, Македоніі, Румыніі, Сербіі, Славакіі, Славеніі, Харватыі, Даніі, Францыі, Італіі, Швецыі, Амана, Турцыі, Ірана, ЗША.

Арганізатарамі кангрэса выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Арганізацыя аб'яднаных нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Бібліятэчная асамблея Еўразіі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». Генеральны партнёр кангрэса — ААТ «Банк БелЗЭБ».